Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 СНЕЖНЯ 2018 г. СЕРАДА № 239 (28855)

ПРАДУКТЫ Ў СВАЮ ТАРУ 5

ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ГЕПАТЫТУ 9

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ПАРТНОЙ, намеснік міністра спорту і турызму:

«Па даных на 29 лістапада, магчымасцямі 30-дзённага бязвізу ў нашу краіну скарысталіся 178 640 чалавек. Больш за ўсё турыстаў прыехала з Германіі (28,5 тысячы), Польшчы (16,3 тысячы) і Італіі (15,6 тысячы). Таксама ў топ-10 краін увайшлі Вялікабрытанія, ЗША, Францыя, Нідэрланды, Латвія, Швецыя, Літва. Па бязвізе Гродна і беларускую частку Аўгустоўскага канала з пачатку гэтага года наведалі больш за 83 тысячы іншаземцаў, Белавежскую пушчу і турысцка-рэкрэацыйную зону «Брэст» — больш за 15,2 тысячы замежных грамадзян. Экспарт турыстычных паслуг у Беларусі за студзень — верасень 2018 года вырас на 14,3 % да $170,9 млн. Больш за палову экспарту прыпала на Расію — $99,2 млн, далей ідуць Аўстрыя, Кітай, Кіпр і Германія».

Дзе снегавік, там і свята

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Уласнымі сіламі супрацоўнікі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Светач» Савецкага раёна сталіцы падрыхтавалі і выставілі на парозе навучальнай установы вулічную скульптуру вялікага снегавіка — як сімвал навагодніх і калядных свят. Намеснік дырэктара ўстановы Алена СОЛТАН *(на здымку ў цэнтры)* і супрацоўнік Дзмітрый БУКАЦІЧ упрыгожваюць гэты святочны твор, які будзе радаваць навучэнцаў і прахожых ажно да сярэдзіны студзеня.

КОРАТКА

- **Цэнтральныя банкі Еўропы спыняць выпуск самай буйной банкноты ў еўра (500), каб знізіць узровень злачыннасці.**
- Колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей знізілася ў Гомелі з 12 выпадкаў у студзені — кастрычніку 2017-га да 9 за аналагічны перыяд сёлета.
- **Стаматалогія, афтальмалогія, дыягностыка і пластычная хірургія — самыя запатрабаваныя паслугі медыцынскага турызму ў Гродне.**



- Польшча прыме ў 2019 годзе дзіцячае «Еўрабачанне», конкурс стане сямнаццатым па ліку.

ЛЁД ХРУСЦІЦЬ ПАДМАНЛІВА...

З першага зімовага лёду сёлета дадому не вярнуліся тры чалавекі. 30 лістапада ў Добрушскім раёне два браты ўзялі санкі і пайшлі пакатацца на раку Іпуць. У нейкі момант лёд хрустнуў — і абодва малыя апынуліся ў ледзяной вадзе. СТАР. 3

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Высокая перспектыва

ХТО ГАЛОЎНЫ Ў АБЛОКАХ?

Беларусь мае шанц заняць месца на адным з самых перспектыўных рынкаў планеты

Неверагодна, але факт: традыцыйныя крылатыя машыны саступаюць неба беспілотным лятальным апаратам (БЛА). Прычым гэта адбываецца настолькі хутка, што праз нейкія дзесяць-пятнаццаць гадоў, як прадказваюць многія спецыялісты, пілатаваная авіяцыя адыдзе ў гісторыю.

Магчыма, падобныя прагнозы крыху паспешлівыя, але мы не можам не верыць сваім вачам: беспілотнікі знаходзяць усё больш шырокае прымяненне. Іх паспяхова выкарыстоўваюць для патрулявання лясоў з мэтай прафілактыкі пажараў, пошуку зніклых людзей і тэхнікі, у метэаралогіі і правядзенні радыялагічнага аналізу мясцовасці, сельскай гаспадарцы, ваеннай справе. З'явілася інфармацыя аб тым, што дроны вось-вось пачнуць дастаўляць пошту, а ў недалёкай будучыні — працаваць у якасці паветраных таксі. Карацей кажучы, перспектывы ў такіх апаратаў бязмежныя. СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!